ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

**Сітуацыя перад выбарамі*2025. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"**

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*2025[1] арганізаваная Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі паводле адкрытых крыніц і паведамленняў ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВЫ

Чарговыя, сёмыя, прэзідэнцкія выбары* у Беларусі прызначаныя Палатай прадстаўнікоў на 26 студзеня 2025 года на фоне глыбокага крызісу правоў чалавека, выкліканага рэпрэсіямі, што наступілі пасля мірных пратэстаў супраць фальсіфікацый на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года. Гэтыя рэпрэсіі захоўваюцца і нават узмацняюцца да гэтага часу: улады працягваюць адвольна пераследваць паводле палітычных падставаў кандыдатаў,[2] чальцоў выбарчых штабоў ды ініцыятыўных груп, назіральнікаў, актывістаў і проста неабыякавых грамадзян, якія паставілі свой подпіс за вылучэнне незалежных прэтэндэнтаў у кандыдаты. Захоўваецца і ўзмацняецца дыскрымінацыйная рыторыка ўладаў, якія абвясцілі людзей, што не падзяляюць праўладныя наратывы "ворагамі".

Раптоўна прызначыўшы выбары* за 6 месяцаў да чаканай даты іх правядзення і пакінуўшы на ўсю працэдуру 95 дзён, улады ў чарговы раз інструменталізавалі электаральныя працэдуры, падагнаўшы дату выбараў пад палітычныя задачы, тым самым парушылі выбарчае заканадаўства з пункту гледжання роўнасці магчымасцяў кандыдатаў і прынцыпу прадказальнасці выбараў, прадугледжанага міжнароднымі стандартамі ў галіне выбараў.

Правядзенне свабоднай і адкрытай выбарчай кампаніі немагчымае ў сітуацыі палітычнага тэрору: спіс палітычных зняволеных штотыдзень папаўняецца і ў ім стабільна больш за 1300 чалавек. Інфармацыйная прастора цалкам зачышчаная; практычна ўсе незалежныя СМІ выціснутыя з краіны, а распаўсюд іх матэрыялаў з-за мяжы значна ўскладнены палітычна матываваным злоўжываннем антыэкстрэмісцкім

---

[1] "Выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі-2025 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі цалкам рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае.

[2] "Кандыдат" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары.

заканадаўствам. "Дзяржаўная ідэалогія" абслугоўвае культ аўтарытарнага кіравання А. Лукашэнкі. У публічным полі няма прызнання важнасці палітычнага плюралізму.

Неймаверны ціск на арганізацыі грамадзянскай супольнасці, асабліва на праваабарончыя арганізацыі, ды іх масавая ліквідацыя выключаюць грамадзянскі кантроль за правядзеннем выбараў. Незалежнае грамадзянскае назіранне за выбарамі ўнутры краіны адсутнічае; з міжнародных назіральнікаў на гэты момант запрошаныя толькі палітычна ангажаваныя.

У такіх умовах ужо можна канстатаваць немагчымасць для грамадзян рэалізаваць свае выбарчыя правы свабодна.

## ПРАВАВАЯ АСНОВА

Заканадаўчая рамка выбараў*2025 сама сабою задае празмерныя абмежаванні для новай электаральнай кампаніі. Перш за ўсё, канстытуцыйныя змены 2022 года звузілі кола актараў, што могуць браць удзел у электаральных працэсах з улікам апісанай ніжэй грамадска-палітычнай сітуацыі:

- для рэалізацыі *пасіўнага выбарчага права* на прэзідэнцкіх выбарах павышаная ўзроставая планка, павялічаны цэнз аселасці ды ўведзены фільтр наяўнасці замежнага ВНЖ або аналагічнага дакумента замежнай дзяржавы: кандыдатам у прэзідэнты зараз можа быць "асоба не маладзейшая за 40 гадоў, што валодае выбарчым правам, пастаянна пражывае ў краіне не менш за 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі, якая не мае і не мела раней грамадзянства замежнай дзяржавы альбо віду на жыхарства ці іншага дакумента замежнай дзяржавы, які дае права на льготы ды іншыя перавагі".[3] Гэтая норма ў цяперашняй фармулёўцы пазбаўляе магчымасці балатавацца ў прэзідэнты не толькі грамадзянам, якія калі-небудзь пражывалі за мяжой з легалізацыяй свайго статусу праз атрыманне віду на жыхарства або аналагічнага дакумента, але і, у прыватнасці, трымальнікаў "карты паляка", наяўнасць якой разглядаецца ўладамі як маркер патэнцыйнай нелаяльнасці і ўжо служыць падставай для абмежавання шэрагу правоў.[4] Акрамя таго, не маюць магчымасці вылучацца ў прэзідэнты грамадзяне, у дачыненні да якіх маецца абвінаваўчы прысуд суда,[5] які набыў законную моц.
- *актыўнага выбарчага права* па-ранейшаму пазбаўленыя недзеяздольныя грамадзяне і асобы, што ўтрымліваюцца паводле прысудаў у месцах пазбаўлення волі (пры гэтым апошнія змены ў Канстытуцыю далі асобам, якія ўтрымліваюцца пад вартай да суда, магчымасць галасаваць).[6] Магчымасці галасаваць па-ранейшаму фактычна пазбаўленыя грамадзяне, якія не могуць вярнуцца ў краіну праз асцярогу адвольнага пераследу паводле палітычных

---

[3] Параўн. з папярэдняй версіяй арт. 80 Канстытуцыі: "Прэзідэнтам можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь паводле нараджэння, не маладзейшы за 35 гадоў, які валодае выбарчым правам і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь не менш за дзесяць гадоў непасрэдна перад выбарамі".
[4] Кіраўнік МУС у сваіх выказваннях удакладняў, што "карта паляка" ўваходзіць у пералік "іншых дакументаў замежнай дзяржавы, якія даюць права на льготы ці іншыя перавагі" (https://belta.by/society/view/grazhdan-belarusi-predlagaetsja-objazat-informirovat-o-priobretenii-drugogo-grazhdanstva-ili-522253-2022/), аб фармаванні асобнай тэндэнцыі дыскрымінацыйнага стаўлення да трымальнікаў "карты паляка" і замежных ВНЖ, гл. Правы чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі, с. 24-25: https://trends.belhelcom.org/storage/reviews/February2024/gc1hO7866DDq8G3X17sq.pdf
[5] Ч. 7 арт. 60 Выбарчага кодэкса
[6] Арт. 64 Канстытуцыі

матываў, паколькі дзяржава не забяспечвае грамадзянам магчымасць прагаласаваць за межамі Рэспублікі Беларусь.[7]

Захоўваецца празмерна абмежавальнае рэалізацыю свабоды асацыяцый заканадаўства, якое ўскладняе стварэнне і дзейнасць палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў,[8] такім чынам, захоўваюцца абмежавальныя ўмовы для ўдзелу ў электаральным працэсе шляхам накіравання нацыянальных назіральнікаў і кандыдатаў у сябры выбарчых камісій.

Новая версія Канстытуцыі таксама радыкальна змяніла размеркаванне ўладных паўнамоцтваў паміж дзяржаўнымі органамі што існавалі ды тымі, што набылі канстытуцыйны статус "вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя" Усебеларускім народным сходам (УНС). Апошняму нададзеныя шырокія паўнамоцтвы, сярод якіх — права "разглядаць пытанне аб легітымнасці выбараў",[9] уключна з выбарамі прэзідэнта.[10] Гэта адкрывае магчымасць для грэбавання волевыяўленнем народа, асабліва з улікам непразрыстага парадку фармавання гэтага органа і адсутнасць дэталёвага рэгулявання падстаў і працэдур для прыняцця падобнага рашэння.[11] Прэзідэнт цяпер абіраецца на пяцігадовы тэрмін з магчымасцю аднаразовага пераабрання.[12] Рэгуляванне электаральных мерапрыемстваў агулам не змянілася і застаецца ў ключавых пытаннях забеспячэння ўсеагульнага, свабоднага, тайнага волевыяўлення супярэчным міжнародным стандартам і рэкамендацыям БДІПЧ АБСЕ, нацыянальных і міжнародных назіральнікаў:[13] сярод іншага, склад і парадак фармавання выбарчых камісій усіх узроўняў застаюцца непразрыстымі і не інклюзіўнымі, адсутнічаюць эфектыўныя механізмы, якія прадухіляюць злоўжыванне адміністрацыйнымі рэсурсамі, празмерна абмежаваныя магчымасці фінансавання расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, захоўваюцца спрэчныя працэдуры датэрміновага галасавання і непразрыстая працэдура падліку галасоў.[14]

Акрамя вышэйпералічанага, існае рэпрэсіўнае рэгуляванне па-ранейшаму пазбаўляе грамадзян рэальных магчымасцяў для праявы незалежнай ініцыятывы, бяспечнай мабілізацыі палітычных прыхільнікаў, выказвання свайго меркавання і рэалізацыі іншых правоў і свабод. Пашырае сваё дзеянне рамка "антыэкстрэмісцкага заканадаўства", якая дазваляе адвольнае абмежаванне шэрагу правоў і свабод на

---

[7] З апошняй рэдакцыі Выбарчага кодэкса былі выключаныя палажэнні аб магчымасці стварэння ўчасткаў для галасавання за мяжой: параўн. з арт. 18 Выбарчага кодэкса ў рэдакцыі ад 04.06.2015 г.

[8] Гл. раздзел "Прававая аснова" ў справаздачы "Сітуацыя перад выбарамі*2024": https://elections2024.spring96.org/be/news/113485

[9] Арт. 89-3 Канстытуцыі

[10] Арт. 18 Закона аб Усебеларускім народным сходзе: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300248

[11] Гл. аналіз гісторыі дзейнасці і механізмаў фарміравання гэтага органа: "Усебеларускі народны сход – форма (не)рэалізацыі права прымаць удзел у вядзенні дзяржаўных спраў" https://elections2024.spring96.org/be/news/115229

[12] Новая версія арт. 80 Канстытуцыі

[13] Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ даступныя ў Базе рэкамендацый па выбарах https://paragraph25.odihr.pl/search?dayOfElection=2019-11-17T00%3A00%3A00.000Z&numberOfTheRecommendationInTheFinalReport=1&numberOfTheRecommendationInTheFinalReport=55&projectBeneficiary=Belarus&typeOfElection=Parliamentary&yearOfElection=2019&yearOfElection=2019; рэкамендацыі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары": https://referendum2022.spring96.org/be/news/107872

[14] Гл. раздзел "Прававая аснова" ў справаздачы "Сітуацыя перад выбарамі*2024": https://elections2024.spring96.org/be/news/113485

падставе прызнання інфармацыйнай прадукцыі або дзейнасці "экстрэмісцкай",[15] захоўваецца рэгуляванне масавых сходаў, якое супярэчыць міжнародным стандартам, заканадаўчая рамка, якая стварае практычную немагчымасць для дзейнасці незалежных СМІ ў межах юрысдыкцыі дзяржавы,[16] сістэмная адсутнасць гарантый справядлівага судовага разбору незалежным судом,[17] што ў сукупнасці[18] пазбаўляе грамадзян і ключавых палітычных актараў магчымасці паўнавартасна і эфектыўна ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі.

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

Запланаваныя на студзень 2024 года прэзідэнцкія выбары* – сёмыя ў гісторыі суверэннай Беларусі. Выбары пасля першых, на якіх у 1994 г. перамог А. Лукашэнка, праводзіліся з парушэннямі базавых міжнародных стандартаў у галіне дэмакратычных выбараў.[19]

Ключавыя ўдзельнікі папярэдняй кампаніі[20] знаходзяцца ў зняволенні, у вымушанай эміграцыі або актыўна ўключаныя ў праўладную павестку.[21] Сярод 1300 палітвязняў,[22] што знаходзяцца цяпер у зняволенні, — экс-прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта Віктар Бабарыка (асуджаны на 14 гадоў пазбаўлення волі),[23] Сяргей Ціханоўскі (асуджаны на 19 гадоў і 6 месяцаў),[24] і шэраг чальцоў іх штабоў, у прыватнасці Марыя Калеснікава (асуджаная на 11 гадоў),[25] якія ўтрымліваюцца ў рэжыме інкамунікада больш за год, што раўназначна гвалтоўнаму знікненню.[26] Экс-кандыдат Андрэй Дзмітрыеў таксама сутыкнуўся з крымінальным пераследам і быў пазбаўлены волі на 1 год і 6 месяцаў.[27] Святлана Ціханоўская і Валерый Цапкала, якія знаходзяцца ў вымушанай эміграцыі, завочна асуджаныя да 15 і 17 гадоў пазбаўлення волі адпаведна,[28] Вераніка Цапкала таксама завочна асуджаная да 12 гадоў пазбаўлення волі.[29]

---

[15] Гл. даклад ПЦ "Вясна" "Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў на падставе барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам": https://spring96.org/files/book/be/abmezhavanni_svabody_vykazvannia_2024.pdf
[16] Беларуская асацыяцыя журналістаў, агляд сітуацыі ў медыясектары ў 2023 г.: https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/smi-belarusi-2023-godze/
[17] Даклад спецдакладчыка ААН па Беларусі, 3 траўня 2023, A/HRC/53/53: https://undocs.org/Home/Mobile?FinalSymbol=A/HRC/53/53&Language=E&DeviceType=Desktop&LangRequested=False
[18] https://index.belhelcom.org/
[19] Гл. справаздачы АБСЕ аб папярэдніх кампаніях са спасылкамі на нацыянальных назіральнікаў: https://www.osce.org/odihr/elections/belarus
[20] Гл. Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года, https://elections2020.spring96.org/be/news/98939
[21] Дзмітрый Чэрачань, Ганна Канапацкая і Алег Гайдукевіч у цяперашні час уключаныя ў праўладны парадак дня, удзельнічалі ва Усебеларускім народным сходзе ў 2024 годзе; Ганна Канапацкая і Алег Гайдукевіч зноў выставілі свае кандыдатуры ў ролі кандыдатаў на выбарах*2025.
[22] https://prisoners.spring96.org/be
[23] https://prisoners.spring96.org/be/person/victar-babaryka
[24] https://prisoners.spring96.org/be/person/siarhiej-cichanouski
[25] https://prisoners.spring96.org/be/person/maryja-kalesnikava
[26] https://spring96.org/ru/news/116576
[27] https://prisoners.spring96.org/be/person/andrei-dzmitryey
[28] https://prisoners.spring96.org/be/person/svjatlana-cikhanouskaja, https://prisoners.spring96.org/be/person/valeryi-capkala
[29] https://prisoners.spring96.org/be/person/veranika-capkala

З 2020 г. актыўна вядзецца пераслед як апазіцыйных палітыкаў, у прыватнасці, Паўла Севярынца, Мікалая Статкевіча, Рыгора Кастусёва,[30] так і шырокага кола іншадумцаў і тых, каго дзяржава адносіць да іх.[31] Напярэдадні пачатку сёлетняга перадвыбарчага этапу, Спецдакладчыца ААН па Беларусі падкрэсліла, што адвольныя затрыманні рэгулярна выкарыстоўваюцца ў якасці сродку ўціску палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці, асабліва ў кантэксце выбараў.[32] "Антыэкстрэмісцкае" заканадаўства і адвольныя, непрадказальныя практыкі яго ўжывання сталі руцінным інструментам рэпрэсій, што сур'ёзна абмяжоўвае не толькі свабоду выказвання меркаванняў і мірных сходаў, але і шэраг сацыяльных ды эканамічных правоў.[33]

З пачатку 2024 года было затрымана не менш за 1800 чалавек. Не змяншаецца маштаб крымінальнага пераследу паводле палітычных матываў: з лістапада 2023 па кастрычнік 2024 гг. распачатыя крымінальныя справы як мінімум супраць 2300 чалавек; па стане на 1 лістапада 2024 г. крымінальны пераслед спазналі як мінімум 7447 чалавек.[34] Не спыняецца ціск на палітвязняў — у тым ліку шляхам ужывання катаванняў[35] і дадавання новых тэрмінаў пазбаўлення волі нібыта за парушэнне правілаў унутранага распарадку ў калоніях.

Улады не спыняюцца ў працэсе зачысткі грамадскага поля, знішчаюць любыя інстытуцыяналізаваныя формы аб'яднання грамадзян як паводле палітычных пытанняў, так і паводле тых, якія наўрад ці звязаныя з палітыкай: культура, грамадства, эканоміка, рэлігія. Са снежня 2023 г. было ліквідавана больш за 350 арганізацый грамадзянскай супольнасці; на канец верасня колькасць ліквідаваных арганізацый, у тым ліку такіх, што прынялі гэтае рашэнне самастойна, складае мінімум 1803 адзінкі. Улады актыўна прыкладаюць намаганні для імітацыі грамадзянскай супольнасці праз падтрымку GONGO і абсалютнай лаяльнасці да сябе.[36]

Беларусь з'яўляецца самай небяспечнай краінай у Еўропе для журналістаў і займае 167 (са 180) пазіцыю ў сусветным індэксе свабоды прэсы арганізацыі "Рэпарцёры без межаў" (RSF) за 2024.[37]

Многія актыўныя грамадзяне, якіх дзеючыя ўлады лічаць нелаяльнымі і таму пераследуюць і запалохваюць, знаходзяцца ў вымушанай эміграцыі. Яны працягваюць зведваць пераслед і трансгранічна, у прыватнасці судовага пераследу, уключна з

---

[30] https://prisoners.spring96.org/be/person/paviel-sieviaryniec, https://prisoners.spring96.org/be/person/mikalaj-statkievich, https://prisoners.spring96.org/be/person/ryhor-kastusiou

[31] Гл. рэгулярныя аналітычныя агляды ПЦ "Вясна": https://spring96.org/be/publications

[32] Даклад Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі A/79/201 https://documents.un.org/doc/undoc/gen/n24/215/24/pdf/n2421524.pdf

[33] Гл. даклад ПЦ "Вясна" "Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў на падставе барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам": https://spring96.org/be/news/114917, https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/ekstremizm-i-media-analitika-bazh/

[34] Крымінальны пераслед з пачатку выбарчай кампаніі 2020. Спіс ад праваабаронцаў "Вясны", https://spring96.org/be/news/99638

[35] Аўтары дакладу камітэта ААН супраць катаванняў A/79/44 канстатавалі, што ўжыванне катаванняў з'яўляецца сістэматычнай практыкай у Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020: https://docstore.ohchr.org/SelfServices/FilesHandler.ashx?enc=dtYoAzPhJ4NMy4Lu1TOebISuY2notzKASnNC2cWnaPqEme3rOW0bwTeAPUbYQC%2FYORUCtgXqbIO3U4pmXl4EPYzn2o%2BclBMmsCWuZG30seo%3D

[36] Маніторынг сітуацыі са свабодай асацыяцый і становішчам арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь Верасень 2024, Lawtrend https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/monitoring-situatsii-so-svobodoj-assotsiatsij-i-polozheniem-organizatsij-grazhdanskogo-obshhestva-v-respublike-belarus-sentyabr-2024

[37] https://rsf.org/en/index?year

сфабрыкаванымі крымінальнымі абвінавачваннямі і завочнымі судовымі працэсамі ў дачыненні да асоб, што знаходзяцца ў выгнанні,ператрусы ў дамах і канфіскацыя маёмасці, індывідуальныя пагрозы і запалохванне родных, што засталіся ў Беларусі. Так, 21 траўня 2024 года Следчы камітэт распачаў крымінальную справу ў дачыненні да 257 чалавек, якія публічна заявілі пра сваё жаданне ўзяць удзел у выбарах у Каардынацыйную раду, якая пазіцыянуе сябе як прадстаўнічы орган беларускай грамадзянскай супольнасці ў выгнанні.[38]

Такім чынам, магчымасць палітычных апанентаў А. Лукашэнкі і прадстаўнікоў прадэмакратычных сілаў удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах*2025 практычна выключаная. Сістэматычны пераслед незалежных кандыдатаў, крымінальныя справы і вымушаная эміграцыя ключавых фігур прадэмакратычных сілаў сведчаць пра тое, што ўдзел у выбарах для іх альбо немагчымы, альбо спалучаны з сур'ёзнымі рызыкамі. На гэтым фоне ўсе магчымыя кандыдаты акрамя кандыдатуры А. Лукашэнкі ўспрымаюцца як падкантрольныя ўладам, чыя роля – фармальна дэманстраваць наяўнасць альтэрнатывы на выбарах*2025, але не рэальна змагацца за ўладу.

Праведзеныя ва ўмовах бесперапынных рэпрэсій і зачышчанага грамадска-палітычнага поля выбары* 2024 г. дазволілі ўладам сфармаваць ніжнюю Палату прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы дэпутатаў, а пасля — корпус УНС, надзеленага шырокімі паўнамоцтвамі (гл. раздзел "Прававая аснова").[39] Такім чынам, пасля 2020 г. не толькі выпустошваюцца магчымасці для рэалізацыі свабоды меркаванняў, сходаў і асацыяцый, але і ўмацоўваецца новая сістэма органаў улады, уведзеная канстытуцыйнымі зменамі несвабоднага рэферэндуму 2022 г.[40] У гэтай канфігурацыі грамадзяне пазбаўленыя рэальнай магчымасці ўдзельнічаць у вядзенні дзяржаўных спраў. Пацвярджэнне "законнага" статусу А. Лукашэнкі завяршае фармаванне гэтай сістэмы.

## Міжнародныя аспекты

У сітуацыі, калі з самага пачатку вядомы пераможца выбараў*, важны міжнародны кантэкст вакол фігуры А. Лукашэнкі.

Беларусь – саўдзельнік вайсковай агрэсіі Расіі супраць Украіны, якая працягваецца амаль 3 гады. 4 кастрычніка 2022 года Лукашэнка прызнаў,[41] што Беларусь удзельнічае ў "спецыяльнай ваеннай аперацыі" ў парушэнне нормаў уласнага нацыянальнага права[42] і базавых прынцыпаў міжнароднага права. Дадатковым фактарам напружанасці стала размяшчэнне ў 2023 г. на тэрыторыі Беларусі расійскай ядзернай зброі.

УВКПЧ адзначала ў сваіх апошніх дакладах, што асобныя дзеянні беларускіх уладаў могуць быць кваліфікаваныя як злачынствы супраць чалавечнасці. 30 верасня 2024 г.

---

[38] Следчы камітэт, Дванаццаць экстрэмісцкіх фармаванняў пачалі барацьбу за "гранты" і арганізавалі псеўдавыбары. Распачатыя крымінальныя справы, 21.05.2024, https://sk.gov.by/ru/news-ru/view/dvenadtsat-ekstremistskix-formirovanij-nachali-borbu-za-granty-i-organizovali-psevdovybory-vozbuzhdeny-13756

[39] Выбары*2024. Выніковая аналітычная Справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года, https://elections2024.spring96.org/be/news/114854

[40] Гл. выніковую аналітычную справаздачу экспертнай місіі па ацэнцы рэспубліканскага рэферэндуму, https://spring96.org/be/news/107872

[41] https://belta.by/president/view/lukashenko-podtverdil-uchastie-belarusi-v-svo-v-ukraine-no-est-vazhnye-njuansy-527204-2022/

[42] Арт. 18 Канстытуцыі

Літоўская Рэспубліка скарысталася правам краіны-удзельніцы Рымскага статута, прадугледжаным артыкулам 14 апошняга, і звярнулася да пракурора Міжнароднага крымінальнага суда з запытам аб расследаванні сітуацыі ў Беларусі з мэтай вызначыць, ці варта прад'явіць беларускім уладам абвінавачванне ў здзяйсненні злачынстваў супраць чалавечнасці.

Акрамя таго, вядома аб саўдзеле рэжыму ў расійскай палітыцы перамяшчэння ўкраінскіх дзяцей з часова акупаваных тэрыторый, іх індактрынацыі і мілітарызацыі, што сталі падставай для выдачы ордара на арышт шэрагу службовых асоб Расіі, уключна з У. Пуціным.